БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна ЗАПРАШАЕ

Абітурыент-79! Цябе гасцінна запрашае Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — адна з буйнейшых навучальных устаноў нашай краіны, у якой навучаецца каля 18 тысяч студэнтаў, а навучальны працэс здзяйсняюць каля 1400 выкладчыкаў, у тым ліку 9 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 90 прафесараў, дактароў навук, 653 дацэнты, кандыдаты навук.

За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў каля 50 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў. Многія з іх сталі вядомымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, буйнымі вучонымі, пісьменнікамі і паэтамі. Сярод выхаванцаў універсітэта ёсць лаўрэаты Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, прэміі Ленінскага камсамола.

Ва універсітэце разам з савецкімі студэнтамі навучаецца каля 700 студэнтаў, аспірантаў і стажораў з 60 краін свету. Ты зможаш пазнаёміцца з імі, даведацца аб іх жыцці, аб праблемах, якія хвалююць твайго равесніка за мяжой.

Ты зможаш займацца ў абсталяваных самымі сучаснымі прыладамі лабараторыях пад кіраўніцтвам вядомых вучоных. Цябе чакаюць прасторныя аўдыторыі, чытальныя залы універсітэцкай фундаментальнай бібліятэкі, фонд якой налічвае 1.521 тыс. тамоў.

У студэнцкіх навуковых гуртках ты зможаш праявіць свае здольнасці да навуковай работы.

Ва універсітэце ёсць вялікія магчымасці для заняткаў спортам, мастацкай самадзейнасцю. А летам цябе з нецярплівасцю чакаюць студэнцкія будаўнічыя атрады.

І калі ты канчаткова зрабіў свой выбар, калі ты адчуваеш прагу да ведаў і хочаш стаць высокаадукаваным спецыялістам — мы гасцінна адкрываем перад табой дзверы буйнейшай навучальнай установы рэспублікі. Чакаем цябе, будучы студэнт, у Беларускім дзяржаўным універсітэце!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (1230) 1 лютага 1979 г. Цана 2 кап.

ЧАРОЎНЫ СВЕТ ХІМІІ



Сёння цяжка пералічыць усе тыя галіны чалавечай дзейнасці, куды б не пранікла хімія. Пры гэтым сучасная хімія цесна пераплятаецца з фізіка-матэматычнымі і біялагічнымі навукамі, таму далейшы навукова-тэхнічны прагрэс ў многіх галінах у значнай меры залежыць ад поспехаў хіміі і хімічнай тэхналогіі.

Хімічны факультэт БДУ ўжо 48 год з'яўляецца адзінай базай у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй.

Вучэбную і навуковую работу на факультэце вядуць 9 дактароў і звыш 100 кандыдатаў навук. Падрыхтоўка студэнтаў здзяйсняецца асобна на вытворчым і педагагічным патоках па васьмі спецыялізацыях: неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, фізічнай хіміі, хіміі паўправаднікоў, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, радыяцыйнай хіміі, будове рэчываў. У саставе факультэта ёсць таксама навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем, у лабараторыях якога студэнтам ужо на малодшых курсах прадастаўляецца шырокая магчымасць спрабаваць свае сілы ў правядзенні навуковых даследаванняў.

За пяцігадовы перыяд навучання на хімічным факультэце студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па асноўных дысцыплінах хімічнага цыкла, грамадскіх навуках, замежнай мове. Акрамя таго, забяспечваецца ў вялікім аб'ёме і фізіка-матэматычная падрыхтоўка.

Падрыхтоўка па спецыялізацыях здзяйсняецца на старэйшых курсах. У гэты перыяд навучання ўсе студэнты выконваюць навуковыя даследаванні, якія перарастаюць у дыпломныя работы. Значная частка дыпломных работ выконваецца ў навукова-даследчых інстытутах і на прадпрыемствах.

Студэнты педагагічнага патока разам з піянерскай і педагагічнай практыкамі праходзяць чатырохтыднёвую вытворчую практыку на хімічных прадпрыемствах рэспублікі. На вытворчым патоку арганізуецца больш працяглая вытворчая практыка на базе перадавых прадпрыемстваў і навукова-даследчых устаноў Масквы, Мінска, Харкава, Казані, Гомеля, Віцебска і інш.

Вялікая ўвага ўдзяляецца мерапрыемствам па ідэйна-палітычнаму, эстэтычнаму, маральнаму выхаванню будучых спецыялістаў. Значнае месца ў жыцці студэнтаў займае таксама і спорт. На факультэце навучаюцца і працуюць 6 майстроў спорту, каля 30 кандыдатаў у майстры спорту і першаразраднікаў, вялікая колькасць спартсменаў масавых разрадаў. Турысцка - альпінісцкая секцыя пастаянна арганізуе паходы па БССР, Карпатах, Каўказу, Саянах, Алтаю, Уралу і ў іншыя месцы нашай Радзімы.

Сапраўдным святам сталі праводзімыя штогод на факультэце дні хіміі, на якія прыязджаюць шматлікія дэлегацыі хімічных ВНУ краіны. Студэнцкі тэатр мініяцюр рыхтуе да свята вялікую музычную праграму. І ўсё гэта прысвячаецца першакурсніку, які дае ў гэтыя дні клятву аб вернасці хіміі на ўсё жыццё.

В. САМАХВАЛ,
намеснік дэкана хімічнага факультэта.

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ — ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА

Факультэт прыкладной матэматыкі ў будучым годзе будзе адзначаць першае дзесяцігоддзе свайго існавання — ён быў створан у 1970 годзе з мэтай прафесіянальнай падрыхтоўкі ў Беларусі матэматыкаў - прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне прымянення матэматычных метадаў вырашэння і даследавання самых розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі з шырокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульнатэарэтычных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, добра знаёмы з магчымасцямі ЭВМ і здольны разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даследчую работу па складанню матэматычных мадэлей розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па стварэнню матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання, ЭВМ і праектаванню саміх АСК і іх комплексаў.

На працягу першых двух год студэнты факультэта прыкладной матэматыкі атрымліваюць глыбокую агульнанавуковую падрыхтоўку, якая ўключае асноўныя матэматычныя дысцыпліны, а таксама асновы эксплуатацыі ЭВМ. Усе гэтыя веды шырока выкарыстоўваюцца кафедрамі факультэта. Спецыяльнасць прыкладная матэматыка ўключае тры спецыялізацыі: прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі, матэматычнае забеспячэнне ЭВМ і матэматычнае забеспячэнне АСК. На V курсе студэнты факультэта праходзяць вытворчую практыку на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых арганізацыях горада Мінска. Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнага праекта і здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму.

Выпускнікам факультэта прысвойваецца кваліфікацыя матэматык. Яны накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя інстытуты, вылічальныя цэнтры, а таксама ў іншыя арганізацыі, якія выкарыстоўваюць ЭВМ. Сёння на ФПМ займаецца каля 1400 студэнтаў.

Уся вучэбная і навукова-даследчая работа са студэнтамі вядзецца супрацоўнікамі вылічальнага цэнтра і дзвюх галіновых лабараторый, а таксама выкладчыкамі васьмі кафедр.

Вялікая ўвага аддаецца самастойнай навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На факультэце працуюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, у якіх студэнты, выкарыстоўваючы тэарэтычныя веды, распрацоўваюць пакеты прыкладных праграм для вырашэння розных задач народнай гаспадаркі і ўкараняюць перспектыўнае матэматычнае забеспячэнне АСК і ЭВМ.

Важная роля на факультэце адводзіцца выхаваўчай рабоце са студэнтамі. У значнай меры яна здзяйсняецца камсамольскай, прафсаюзнай і іншымі грамадскімі арганізацыямі студэнтаў. Гэта работа заключаецца ў правядзенні сустрэч з ветэранамі працы, з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, у арганізацыі культурнага адпачынку і спартыўных спаборніцтваў, а таксама ў вырашэнні праблемы найлепшага выкарыстання вольнага часу.

Запрашаем выпускнікоў сярэдніх школ і здольную моладзь, якая працуе, жадае атрымаць спецыяльнасць матэматыка-прыкладніка, прыняць удзел у конкурсных экзаменах.

Я. ІВАНОЎ,
дэкан факультэта прыкладной матэматыкі.

Радыёфізіка—навука будучага

Цяжка ўявіць сабе існаванне чалавецтва без радыёэлектронікі, без радыё і тэлебачання, без электронных матэматычных машын і звычайных камп'ютэраў.

Хто павінен кіраваць усімі гэтымі складанымі сістэмамі, хто павінен іх удасканальваць і распрацоўваць новыя мадэлі?

Гэта задача па плячу высококваліфікаваным спецыялістам, радыёфізікам, якіх рыхтуе факультэт радыёфізікі і электронікі.

Чым адрозніваецца выпускнік факультэта радыёфізікі і электронікі ад выпускнікоў тэхнічных ВНУ аналагічнага профілю? Перш за ўсё фундаментальнай фізіка-матэматычнай і шырокай радыёфізічнай падрыхтоўкай, якая дазваляе маладому спецыялісту свабодна арыентавацца ў фізічных прынцыпах і тэндэнцыі развіцця электронных прылад і сістэм. Гэтаму садзейнічае глыбокая агульнанавуковая падрыхтоўка па фізіцы і матэматыцы на малодшых курсах, а затым вялікі цыкл агульных радыёфізічных курсаў. і лабараторый.

На трэцім годзе навучання студэнт выбірае адну з наступных спецыялізацый:

Фізічная электроніка і мікраэлектроніка. Спецыялізацыю здзяйсняе кафедра радыётэхнікі і фізічнай электронікі.

Аўтаматызацыя навуковых даследаванняў. Спецыялізацыю здзяйсняе кафедра электронных матэматычных машын па заданню прэзідыума АН БССР. Студэнтам гэтага профілю чытаецца шэраг дысцыплін па машынных метадах апрацоўкі інфармацыі. Яны вывучаюць комплексы радыёэлектроннай апаратуры, неабходнай для аўтаматызацыі працэсаў навуковых даследаванняў.

Электронныя матэматычныя машыны. Гэту спецыялізацыю таксама забяспечвае кафедра ЭММ. Студэнты вывучаюць тэорыю вылічальных машын і праграміравання, структуру сучасных лічбавых вылічальных машын, метады вылічэнняў.

Прыём і апрацоўка інфармацыі. Спецыялізацыю здзяйсняе кафедра радыёфізікі і электронікі звышвысокіх частот. Студэнты вывучаюць метады генерацыі, умацавання, распаўсюджвання, прыёму і апрацоўкі сігналаў сучаснымі метадамі.

Квантавая радыёфізіка і інфрачырвоная тэхніка. Спецыялізацыю здзяйсняе кафедра электрафізікі. Студэнты вывучаюць прыёмна-перадаючыя оптаэлектронныя прылады і прыстасаванні, якія ўключаюць квантавыя паўправадніковыя генератары і інфрачырвоную тэхніку.

У перыяд спецыялізацыі студэнты факультэта маюць неабмежаваныя магчымасці ўдзелу ў выкананні навукова-даследчых работ у студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях (СНДЛ), у студэнцкім вылічальным цэнтры, у лабараторыях кафедр і інстытутаў з залічэннем на стаўкі навуковых супрацоўнікаў.

Вытворчую і пераддыпломную практыку студэнты праходзяць на прадпрыемствах і ва ўстановах па месцу сваёй будучай работы, куды яны размяркоўваюцца за год да заканчэння універсітэта.

Студэнтам - радыёфізікам ствараюцца добрыя матэрыяльныя ўмовы для вучобы: размер стыпендыі ў радыёфізікаў вышэй, чым у іншых студэнтаў універсітэта, іншагароднім студэнтам прадастаўляецца інтэрнат.

Выпускнікі факультэта працуюць у лабараторыях, СКТБ прадпрыемстваў электроннай і радыёпрамысловасці, у розных інстытутах Акадэміі навук БССР. Лепшыя студэнты працягваюць вучобу ў аспірантуры.

А. ЛАБУДА,
дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі.

На здымку: заняткі па статыстычнай радыёфізіцы вядзе дацэнт **І. Данейка.**

З ПЯРОМ І ФОТААПАРАТАМ

У папулярнай песні аб журналістах ёсць такія словы: «Трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете. Если б снова начать, я бы выбрал опять бесконечные хлопоты эти». Вельмі ёмістае азначэнне сутнасці журналісцкай работы: нялёгкая, часам знясільваючая праца, якая прыносіць, аднак, ні з чым не параўнальнае маральнае задавальненне. Журналістыка — гэта пошук, нястомная барацьба за ідэалы нашага грамадства, за здзяйсненне партыйных рашэнняў, журналістыка — гэта неабходная ў наш час сувязь чалавека са здзіўляючa складаным і цікавым светам, у якім мы жывём...

У нашай рэспубліцы гэтай прафесіі навучаюць на факультэце журналістыкі БДУ. Каля трох тысяч яго выпускнікоў працуюць паспяхова ў газетах, часопісах, выдавецтвах, на тэлебачанні і радыёвяшчанні Беларусі і ў іншых рэспубліках нашай Радзімы.

Паступаючыя на факультэт журналістыкі павінны даказаць, што іх выбар не выпадковы. Для гэтага праводзіцца творчы конкурс перад экзаменамі. На конкурс павінны быць прадстаўлены апублікаваныя ў газетах або перададзеныя па тэлебачанню і радыё матэрыялы, рэкамендацыі рэдакцый, у якіх супрацоўнічаў паступаючы; тыя, хто прайшоў гэты першы этап конкурсу, выконваюць спецыяльнае пісьмовае заданне, затым праходзяць субяседаванне. Практыка паказала, што творчы конкурс дапамог значна палепшыць адбор здольнай моладзі, якая мае схільнасць да літаратурнай дзейнасці. Гэтаму садзейнічае таксама «Школа юнкораў», створаная на факультэце.

З методыкай журналісцкай работы студэнтаў пазнаёмяць на лекцыях, практычных і семінарскіх занятках, якія праводзяць вопытныя выкладчыкі. На факультэце студэнт выпусціць вучэбную газету, сам адрэдагуе яе і звярстае, выступіць па вучэбнаму тэлебачанню і радыё з рэпартажам, карэспандэнцыяй, возьме інтэрв'ю ў свайго таварыша або госця, які прыйшоў на сустрэчу са студэнтамі.

Асабліва прадукцыйна спасцігаецца будучая спецыяльнасць у час вытворчых і вучэбных практык. Яны праходзяць у рэдакцыях рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, а таксама на студыях тэлебачання і радыёвяшчання. У гэты час студэнты па-сапраўднаму каштуюць, як гаворыцца, журналісцкі хлеб. Яны ездзяць у камандзіроўкі па заданнях рэдакцый, дапамагаюць асвятляць самыя розныя бакі нашага жыцця. Курс «Журналісцкае майстэрства» на факультэце вядуць выключна практыкі, што дазваляе студэнтам пазнаёміцца з творчай лабараторыяй найбольш яркіх беларускіх журналістаў, пераняць некаторыя прыёмы і метады іх работы.

Журналіст — чалавек беззурботны. Аб гэтым гаворыць той факт, што ўжо некалькі год запар мастацкая самадзейнасць факультэта на універсітэцкіх аглядах атрымлівае самую высокую адзнаку журы. А ў факультэцкім тэатры мініяцюр усміхаецца нават самы змрочны глядач.

Каб «трое суток шагать», як пяецца ў прыведзенай вышэй песні, трэба валодаць выдатным здароўем, быць заўсёды ў спартыўнай форме. Студэнты факультэта журналістыкі ў гэтых адносінах поўнасцю падрыхтаваны да будучай работы. Ёсць сярод іх выдатныя гімнасты, лёгкаатлеты, футбалісты, барцы, штангісты — спартыўныя секцыі працуюць круглы год.

Будучыя журналісты — актыўныя члены студэнцкага навуковага таварыства. На факультэце працуе пяць навуковых гурткоў.

Цяжка пералічыць усё, што складае гэта ёмістае паняцце — факультэт журналістыкі. Гэта шырока раскрытыя дзверы ў свет савецкага друку. Яны перад табой, абітурыент!

Р. БУЛАЦКІ,
дэкан факультэта журналістыкі.

МАТЭМАТЫКА НЕАБХОДНА ЎСІМ

Матэматыка сярод іншых навук займае асаблівае месца. Больш чым сто год назад Карл Маркс гаварыў, што навука толькі тады дасягае дасканаласці, калі ёй удаецца карыстацца матэматыкай. Гэтыя словы Маркса знаходзяць усё большае сцвярджэнне ў апошнія дзесяцігоддзі, калі пачаўся інтэнсіўны працэс матэматызацыі многіх навук. Сёння немагчыма цалкам даведацца аб заканамернасцях як нежывой, так і жывой прыроды, разумна кіраваць вытворчымі працэсамі і развіццём народнай гаспадаркі, ствараць аўтаматычныя паточныя лініі і здзяйсняць касмічныя палёты без шырокага і сістэматычнага выкарыстання матэматыкі.

Спецыялістаў, якія ўмеюць творча валодаць матэматычным апаратам, рыхтуе механіка-матэматычны факультэт.

Факультэт мае чатыры аддзяленні: навукова-вытворчае, навукова-педагагічнае, аддзяленне механікі і вячэрняе аддзяленне. Студэнты ўсіх чатырох аддзяленняў вывучаюць такія фундаментальныя матэматычныя дысцыпліны, як вышэйшая алгебра, аналітычная і дыферэнцыяльная геаметрыя, матэматычны і функцыянальны аналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні, матэматычная логіка. З другога боку, вялікая ўвага аддаецца матэматычным дысцыплінам, якія адкрываюць шырокія магчымасці для прыкладання матэматыкі: вылічальныя машыны і праграміраванне, метады вылічэнняў, даследаванне аперацый і інш.

Кожнае аддзяленне мае сваю спецыфіку ў адпаведнасці з профілем будучай работы студэнта. На навукова-вытворчым аддзяленні студэнтаў вучаць пастаноўцы і рашэнню розных матэматычных задач, узнікаючых у дадатках. На аддзяленні механікі разам з матэматычнымі дысцыплінамі вывучаюцца такія, як гідрамеханіка, тэорыя пругкасці і інш. Студэнты навукова-педагагічнага патока, акрамя ўказаных вышэй прадметаў, вывучаюць таксама дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару і праходзяць педагагічную практыку.

Вучэбны працэс будуецца так, што студэнтам пастаянна прывіваюцца навыкі самастойнай работы і творчага пошуку. На першых двух курсах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі. На трэцім курсе студэнты факультэта выбіраюць спецыялізацыю на адной з кафедр. Яны пачынаюць слухаць спецкурсы і ўключаюцца ў работу спецыяльных семінараў. Пачынаючы з першага курса студэнты факультэта знаёмяцца з работай на ЭВМ у вылічальным цэнтры універсітэта.

Характар работы выпускнікоў механіка-матэматычнага факультэта рознабаковы. Найбольш здольных накіроўваюць у аспірантуру універсітэта або АН БССР.

Асноўная частка выпускнікоў навукова-вытворчага патока і аддзялення механікі накіроўваецца на работу, звязаную з дадаткамі матэматыкі: у навукова-даследчыя і галіновыя інстытуты, праектныя і планава-эканамічныя арганізацыі, вылічальныя цэнтры, заводскія лабараторыі.

Выпускнікі навукова-педагагічнага аддзялення накіроўваюцца на выкладчыцкую работу ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і ў сярэднія школы.

Многія выпускнікі сярэдніх школ баяцца паступаць на механіка-матэматычны факультэт, лічачы сябе недастаткова здольнымі да матэматыкі. Трэба падкрэсліць, што ніякіх асаблівых здольнасцей для паспяховай вучобы на гэтым факультэце не патрабуецца. Выдатны савецкі матэматык акадэмік І. Г. Пятроўскі гаварыў: «Талент, здольнасці ў якой-небудзь галіне дзейнасці — гэта перш за ўсё здольнасць многа, упарта працаваць і мець глыбокі інтарэс да справы. Тады і працаваць будзе лёгка, тады і прыйдзе поспех!».

А. ФЯДЭНКА,
дэкан механіка-матэматычнага факультэта.

Неабсяжныя прасторы фізікі

Неабсяжны свет фізічных з'яў навокал нас, і ён варты таго, каб яго даследаванню прысвяціць сваё жыццё. І не толькі таму, што вывучэнне фундаментальных праблем у фізіцы набліжае нас да разумення паходжання і эвалюцыі сусвету, жыцця і розуму. Поспехі фізікі абумоўліваюць і перспектывы развіцця нашай цывілізацыі: фізіка з'яўляецца асновай сучаснай навукі і тэхнікі. І, безумоўна, з далейшым пранікненнем чалавека ў космас і мікрасвет значэнне фізікі ў жыцці чалавецтва стане яшчэ больш вызначальным.

Прымяненне фізічных метадаў даследавання абумовіла нябачаны росквіт сучаснай біялогіі і медыцыны, электронікі, хіміі і г. д. Зараз няма ніводнай галіны навукі і народнай гаспадаркі, якія б не мелі патрэбы ў спецыялістах-фізіках высокай кваліфікацыі. Такіх спецыялістаў рыхтуюць на фізічным факультэце БДУ. У яго састаў уваходзяць 10 кафедр, якія здзяйсняюць падрыхтоўку фізікаў са спецыялізацыямі ў самых рознабаковых галінах сучаснай фізічнай навукі: тэарэтычнай фізіцы, фізіцы ядра і элементарных часціц, фізіцы ядзерных энергетычных установак, фізіцы цвёрдага цела, біяфізіцы, фізіцы паўправаднікоў, оптыцы і спектраскапіі, цеплафізіцы, оптаэлектроніцы, мікраэлектроніцы, радыяцыйнаму матэрыялазнаўству.

У апошнія гады на факультэце створаны галіновыя навукова-даследчыя лабараторыі, якія на аснове дасягненняў фундаментальнай навукі выконваюць распрацоўкі па канкрэтных заданнях прамысловасці. Факультэт падтрымлівае дзелавыя і навуковыя кантакты з айчыннымі і замежнымі ВНУ. Шырока практыкуецца стажыроўка маладых супрацоўнікаў, аспірантаў, а таксама і студэнтаў старэйшых курсаў у замежных ВНУ.

Высокі тэарэтычны ўзровень агульнанавуковай і агульнапрафесіянальнай падрыхтоўкі, якая базіруецца на фундаментальнай матэматычнай аснове ў спалучэнні са спецыялізацыяй у адной з галін фізікі, дазваляе выпускнікам навукова-вытворчага аддзялення факультэта адразу ж пасля заканчэння універсітэта ўключыцца ў самастойную вытворчую або навукова-даследчую работу на прадпрыемствах рэспублікі ці ў навукова-даследчых інстытутах. Навукова-педагагічнае аддзяленне факультэта рыхтуе выкладчыкаў фізікі для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і сярэдніх школ.

У лабараторыі ядзернай фізікі.

Фота **В. Драчова.**

Агульнанавуковая падрыхтоўка спецыялістаў здзяйсняецца ў асноўным на працягу першых двух год навучання. Акрамя класічных раздзелаў агульнай фізікі, студэнты вывучаюць грамадскія дысцыпліны і замежную мову. Вывучэнне фізічных дысцыплін базіруецца на фундаментальнай матэматычнай аснове. У цэнтры ўвагі знаходзяцца як класічны напрамак у фізіцы, так і сучасныя: тэорыя класічных і квантавых палёў, тэорыя элементарных часціц, спецыяльная і агульная тэорыя адноснасці, квантавая электроніка і інш.

Фізіка — навука пярэдняга краю, навука-разведчык, межы яе ляжаць у галіне фантастыкі, а часам і подзвігу. Яна настолькі цікавая, наколькі і цяжкая. Наш фізічны факультэт шырока адкрывае дзверы перад тымі, хто вырашыў прысвяціць сябе аднаму з самых цікавых і неабходных напрамкаў чалавечага пазнання. Фізіка чакае захопленых!

І. ЗЯЦЬКОЎ,
дэкан фізічнага факультэта.

ТАЯМНІЦЫ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Вышэйшая філалагічная адукацыя ў Беларусі бярэ свой пачатак з часу арганізацыі універсітэта. І мы ганарымся тым, што сярод першых выкладчыкаў беларускай філалогіі быў народны паэт БССР К. М. Міцкевіч (Якуб Колас). У даваенныя гады на факультэце працавалі такія вядомыя філолагі, як І. І. Замоцін, Я. І. Барычэўскі, А. М. Вазнясенскі, М. М. Піатуховіч і іншыя.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры; рускай мове і літаратуры. Вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу вядуць 8 кафедр, якія аб'ядноўваюць буйны навукова-педагагічны калектыў. Свае багатыя веды і любоў да родных беларускай і рускай моў і літаратур перадаюць моладзі высокакваліфікаваныя спецыялісты.

На факультэце грунтоўна вывучаюцца грамадскія навукі: гісторыя КПСС, марксісцка-ленінская філасофія, палітычная эканомія, навуковы камунізм, асновы навуковага атэізму, гісторыя філасофіі, марксісцка-ленінская этыка, логіка, марксісцка-ленінская эстэтыка, гісторыя СССР і гісторыя БССР.

Акрамя родных моў і літаратур, усе студэнты вывучаюць таксама замежныя мовы (англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую), лацінскую мову і славянскія мовы (польскую, серба-харвацкую, чэшскую, балгарскую). На першым курсе студэнтам чытаецца курс «Уводзіны ў спецыяльнасць».

Сярод дысцыплін, якія вызначаюць філалагічную падрыхтоўку студэнтаў, належыць адзначыць мовазнаўчыя і літаратуразнаўчыя.

Да мовазнаўчых дысцыплін адносяцца курсы ўводзін у мовазнаўства і агульнае мовазнаўства, уводзіны ў славянскую філалогію, стараславянская мова, дыялекталогія, асновы культуры мовы. Найбольшая колькасць гадзін адводзіцца на курс сучаснай беларускай (рускай, славянскай) літаратурнай мовы і яе гісторыі як дысцыпліны.

Літаратуразнаўчыя дысцыпліны ўключаюць у сябе ўводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю крытыкі, вусную народную творчасць, гісторыю літаратуры, сучасную савецкую літаратуру, гісторыю замежных літаратур і літаратур народаў СССР.

Факультэт ганарыцца тым, што сярод яго выпускнікоў ёсць вядомыя пісьменнікі і паэты: К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, К. Чорны, П. Трус, І. Мележ, А. Адамовіч, І. Навуменка і многія іншыя. І зараз у літаратурным аб'яднанні «Узлёт» рыхтуецца стаць пісьменнікамі і крытыкамі творчая моладзь факультэта.

Пры кафедрах працуюць гурткі, у якіх студэнты займаюцца навукова-даследчай работай.

Факультэт — буйнейшы цэнтр у краіне па падрыхтоўцы русістаў для замежных краін. Толькі за апошнія 10 год на філфаку прайшлі навучанне каля 400 студэнтаў з ГДР, ПНР, СФРЮ, ЧССР, НРБ, Францыі, Даніі, Ірака, Судана, Йемена, Малі, Ганы і іншых краін.

Таго, хто хоча глыбока пазнаць таямніцы роднай мовы і літаратуры, факультэт чакае ў сваіх аўдыторыях.

А. ВОЛК,
дэкан філалагічнага факультэта.

Ветру і сонцу брат

Геаграфічны факультэт БДУ з'яўляецца буйнейшым у рэспубліцы цэнтрам навуковай геаграфічнай думкі і падрыхтоўкі спецыялістаў-географаў.

Сёння географы факультэта вырашаюць шэраг буйных народнагаспадарчых праблем: комплекснае выкарыстанне прыродных умоў і рэсурсаў, распрацоўка планаў і шляхоў пераўтварэння прыроды раёнаў, вывучэнне сучасных фізіка-геаграфічных працэсаў і іх прагназіраванне, рацыянальнае размяшчэнне вытворчых сіл, вывучэнне тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў, працоўных рэсурсаў, развіцця гарадоў, рэкрэацыйнай дзейнасці, турызму і інш.

У саставе факультэта 7 кафедр, дзве лабараторыі — праблемная лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства, мінералагічны музей і вучэбна-геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна», Браслаўская лімналагічная станцыя.

Педагагічную і навуковую работу вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты, сярод якіх 8 прафесараў і 34 дацэнты. Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі, у якіх студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў займаюцца навуковымі даследаваннямі.

Зыходзячы з задач, якія стаяць перад географамі, факультэт рыхтуе спецыялістаў па фізічнай і эканамічнай геаграфіі на дзённым, вячэрнім і завочным аддзяленнях.

Падрыхтоўка спецыялістаў па турызму і краязнаўству вядзецца толькі на дзённым аддзяленні. Пасля заканчэння факультэта выпускнікі накіроўваюцца на работу ў сярэднія школы, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, навукова-даследчыя і праектныя інстытуты, гаспадарчыя, планавыя арганізацыі, на картаграфічныя фабрыкі, у абласныя і экскурсійныя бюро, на турбазы і інш.

Падрыхтоўка спецыялістаў-географаў вядзецца на аснове фундаментальных навук: фізікі, матэматыкі, хіміі і інш. Спецыяльная падрыхтоўка пачынаецца з II курса. Студэнты вывучаюць шырокае кола геаграфічных дысцыплін: тапаграфію з асновамі геадэзіі, агульнае землязнаўства, астраномію, геалогію, гідралогію, метэаралогію, кліматалогію і інш.

Географы вывучаюць прыроду, народную гаспадарку сацыялістычных краін у галіновым і раённым аспекце, гаспадарчае выкарыстанне прыродных рэсурсаў у святле эканамічнага супрацоўніцтва краін і міжнароднага геаграфічнага раздзялення працы. Студэнты атрымліваюць комплексную падрыхтоўку ў галіне прымянення геаграфічных метадаў вывучэння прыродных рэсурсаў, насельніцтва і гаспадаркі капіталістычных і развіваючыхся краін.

У падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў вялікая ўвага ўдзяляецца вучэбным і вытворчым практыкам. Студэнты I і II курсаў на вучэбнай станцыі «Заходняя Беразіна» праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геамарфалогіі, глебазнаўству, мінералогіі. Штогадовая комплексная геаграфічная практыка студэнтаў II курса праводзіцца за межамі рэспублікі (у Карпатах, на Каўказе, на Урале, у Карэліі, у Сярэдняй Азіі). Для больш глыбокага вывучэння прыроды, гаспадаркі і насельніцтва замежных дзяржаў студэнты накіроўваюцца на практыку ў Балгарыю, Югаславію або Польшчу. Студэнты старэйшых курсаў праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых, праектных, планавых арганізацыях, у экспедыцыях.

М. РАМАНОЎСКІ,
дэкан геафака.

НА ЗДЫМКУ: вывучэнне азёраў студэнтамі геафака ў час практыкі.

ВЕДАЦЬ МІНУЛАЕ, РАЗУМЕЦЬ СУЧАСНАЕ

Разумець свет не толькі сучасны, але глыбока ведаць мінулае грамадства, каб прадбачыць яго будучыню, — асноўная задача гісторыка.

На факультэце тры аддзяленні: гісторыі, палітэканоміі, філасофіі. Выпускнік гістфака — гэта спецыяліст з глыбокай ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўкай, шырокім кругаглядам, высокім культурным узроўнем. Разам з тым факультэт дае глыбокія спецыяльныя веды, неабходныя для будучай прафесіі. Кожнае аддзяленне рыхтуе спецыялістаў пэўнага профілю. Аддзяленне гісторыі — спецыялістаў-гісторыкаў: настаўнікаў, выкладчыкаў тэхнікумаў, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў і ВНУ, навуковых работнікаў.

Выпускнікі аддзялення філасофіі накіроўваюцца на работу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і навукова-даследчыя інстытуты, сацыялагічныя лабараторыі і на буйныя прамысловыя прадпрыемствы (інжынерамі-сацыёлагамі).

Спецыялістаў шырокага профілю рыхтуе аддзяленне палітэканоміі. Яго выпускнікі накіроўваюцца на работу ў ВНУ і тэхнікумы, у навуковыя ўстановы, а таксама на буйныя прадпрыемствы — інжынерамі-эканамістамі.

У час вучобы студэнты-гісторыкі размяркоўваюцца ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі па групах спецыялізацый: гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі, гісторыі КПСС, гісторыі рэлігіі і атэізму, гісторыі культуры, археалогіі і этнаграфіі.

Вучэбны план аддзялення гісторыі прадугледжвае праходжанне студэнтамі шэрагу практык: археалагічнай, этнаграфічнай, архіўнай, музейнай, азнаямленчай, піянерскай, педагагічнай, грамадска-палітычнай. Археалагічная практыка стаіць у гэтым шэрагу першай, таму што яна праходзіць пасля першага курса, і таму, што студэнты лічаць яе самай захапляючай: яна авеяна рамантыкай творчага пошуку, паходнага жыцця, знаёмстваў з новымі месцамі.

Заўсёды з нецярплівасцю чакаюць гісторыкі азнаямленчай практыкі. Яе мэта заключаецца ў тым, каб пазнаёміць студэнтаў з найбольш каштоўнымі помнікамі гісторыі і культуры нашай краіны. Звычайна гэта практыка праходзіць або на тэрыторыі Беларусі, або ў Ленінградзе. Частка студэнтаў выязджае на азнаямленчую практыку ў ГДР.

У час піянерскай практыкі студэнты працуюць на працягу месяца старшымі піянерважатымі і выхавацелямі ў піянерскіх лагерах.

Асноўная ўвага пры падрыхтоўцы філосафаў удзяляецца глыбокаму вывучэнню дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму і гісторыі філасофскай думкі. У вучэбны план уключаны таксама асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі і іншыя прыродазнаўча-навуковыя дысцыпліны.

Спецыялізацыя ў філосафаў ідзе па двух напрамках: дыялектычны і гістарычны матэрыялізм і сацыялогія.

Вучоба на аддзяленні палітэканоміі ўзбройвае веданнем сутнасці вытворчых адносін, заканамернасцей і законаў сацыялістычнага, а таксама капіталістычнага і дакапіталістычнага спосабаў вытворчасці. Будучыя эканамісты атрымліваюць салідную матэматычную падрыхтоўку, вывучаюць гісторыю народнай гаспадаркі СССР і замежных краін, эканоміку асобных галін народнай гаспадаркі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму і іншыя спецыяльныя эканамічныя дысцыпліны.

Вучэбна-вытворчая практыка, якую праходзяць студэнты-палітэканомы, мае мэтай азнаямленне з арганізацыяй сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, функцыямі кіраўніка адміністрацыйнага апарату, пастаноўкай планавання і ўліку.

Кім бы ні працаваў наш выпускнік, ён заўсёды з'яўляецца актыўным прапагандыстам палітыкі КПСС, грамадскім актывістам, арганізатарам.

І. ЦАРУК.
дэкан гістфака.

Біёлаг—спецыяліст шырокага профілю

У цяперашні час біялогія як тэарэтычная аснова медыцыны, сельскай, лясной і паляўнічай гаспадаркі і шэрагу іншых біялагічных вытворчасцей (антыбіётыкаў, біяпрэпаратаў і інш.) стала непасрэднай вытворчай сілай. Перад біялогіяй стаіць таксама грандыёзная і вельмі актуальная задача: поўнае асваенне біялагічных рэсурсаў зямлі нашай планеты і іх захаванне.

Атрымаць любімую спецыяльнасць — рэальная мара. Можна выбраць любую з дзесяці ВНУ нашай рэспублікі, на факультэтах якой праводзіцца падрыхтоўка біёлагаў. Сярод іх біялагічны факультэт БДУ з'яўляецца вядучым. На ім рыхтуюць кваліфікаваных біяхімікаў, гідрабіёлагаў, генетыкаў і цытолагаў, мікрабіёлагаў, фізіёлагаў раслін, фізіёлагаў чалавека і жывёл, заолагаў і батанікаў, спецыялістаў па ахове прыроды.

З 1979 года на факультэце будзе праводзіцца падрыхтоўка па трох спецыяльнасцях: біёлаг, біёлаг-біяхімік, біёлаг-генетык.

Пры факультэце працуе лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, у якой вядуцца даследаванні па гідрабіялогіі, малекулярнай генетыцы мікраарганізмаў, біяэнергетыцы і цытагенетыцы.

Вучэбную практыку студэнты-біёлагі праходзяць у вучэбных лабараторыях кафедр, у навукова-даследчых лабараторыях факультэта, у батанічным садзе універсітэта, у заалагічным музеі, аранжарэі, вучэбна-даследчай гаспадарцы «Шчамысліца» і на біястанцыі «Нарач». Вытворча-азнаямляльная практыка адбываецца ў ВНУ ГДР.

Пасля агульнабіялагічнай, фізіка-матэматычнай і хімічнай падрыхтоўкі студэнты з III курса прыступаюць да спецыялізацыі ў выбранай імі галіне біялогіі: на кафедрах яны слухаюць спецыяльныя лекцыйныя курсы, праходзяць спецпрактыкум, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы. Студэнты шырока прыцягваюцца да навуковых даследаванняў па заданнях кафедр. Пры кафедрах і лабараторыях працуюць дзевяць студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў. Члены студэнцкага навуковага таварыства актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах. І, як правіла, работы іх заслугоўваюць высокай адзнакі. Многія з іх публікуюцца ў навуковых зборніках.



Даследаванні вядуць біёлагі.

Фота **Д. Прэса.**

Акрамя набыцця сучасных біялагічных ведаў, студэнты засвойваюць навыкі арганізатарскай і грамадскай работы.

Спецыялістам, якія скончылі біялагічны факультэт па спецыяльнасцях біялогія-біяхімія, біялогія-генетыка, прысвойваецца кваліфікацыя біёлаг-біяхімік, біёлаг-генетык, выкладчык біялогіі і хіміі.

А. ПІКУЛЕЎ,
дэкан біяфака.

ПАД СЦЯГАМ ФЕМІДЫ

Юрыдычны факультэт з'яўляецца галоўным цэнтрам у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству. Тысячы юрыстаў з дыпломамі Белдзяржуніверсітэта працуюць у судах, пракуратуры, адвакатуры, міліцыі, а таксама ў савецкіх, партыйных, прафсаюзных, навуковых і гаспадарчых установах краіны.

На юрыдычным факультэце ў розны час працавалі вядомыя вучоныя нашай рэспублікі акадэмікі У. Пічэта, М. Грэдынгер, Н. Нікольскі; прафесары В. Дурдзянеўскі, Г. Гурвіч, П. Галанза, Н. Канаплін і іншыя.

Лепшыя студэнты-выпускнікі факультэта залічваюцца ў аспірантуру. Вялікая частка выкладчыкаў, якія працуюць цяпер на факультэце,— былыя яго выпускнікі. Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх важных законаў Беларускай ССР. У прыватнасці, яны былі ўключаны ў рабочыя групы па падрыхтоўцы Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага, Грамадзянскага, Грамадзянска-працэсуальнага, Працоўнага, Зямельнага і іншых кодэксаў Беларускай ССР.

Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў кодэксаў і іншых законаў шырока прыцягваюцца студэнты факультэта.

У навукова-даследчых гуртках студэнты займаюцца над абранымі тэмамі, звязанымі з расследаваннем і кваліфікацыяй учынкаў, разглядам у судах грамадзянскіх спраў.

У студэнтаў ёсць магчымасць пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў даследаваць і тэарэтычныя праблемы дзяржавы і права.

Навучанне на юрыдычным факультэце вядзецца па трох формах: дзённай, вячэрняй і завочнай. Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па адной спецыяльнасці — правазнаўству.

Факультэт мае шырокія замежныя сувязі: вучоныя выязджаюць на стажыроўку ва універсітэты ГДР, ЧССР, ПНР, Балгарыі, Венгрыі і г. д.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць гісторыю КПСС, палітэканомію, марксісцка - ленінскую філасофію, навуковы камунізм, тэорыю дзяржавы і права, гісторыю дзяржавы і права, гісторыю палітычных вучэнняў, савецкае дзяржаўнае права, адміністрацыйнае права і іншыя. На старэйшых курсах прадугледжана спецыялізацыя навучання па трох напрамках: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой і судова-пракурорска-следчай. Дзяржаўна-прававая спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, а таксама ў выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, апаратах міністэрстваў і ведамстваў. Выпускнікі факультэта па гэтай спецыялізацыі працуюць у ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, абкомах і райкомах партыі, райвыканкомах і іншых установах. Выпускнікі па гаспадарча-прававой спецыялізацыі ўзначальваюць прававыя аддзелы міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў і ўстаноў, працуюць юрысконсультамі. Шырокай папулярнасцю карыстаецца судова-пракурорска - следчая спецыялізацыя, па якой рыхтуюцца суддзі, пракуроры, следчыя і адвакаты. У Беларускай ССР цяжка знайсці раён, у якім бы не працавалі выпускнікі нашага факультэта.

У працэсе навучання студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, у юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. У час вытворчай практыкі яны прымаюць удзел у расследаванні складаных крымінальных спраў, знаёмяцца з практыкай работы крымінальнага пошуку, аддзелаў барацьбы з крадзяжом сацыялістычнай уласнасці.

Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

У сувязі з тым, што работа следчага, суддзі, пракурора, адваката патрабуе не толькі юрыдычных ведаў, але і пэўнага практычнага і жыццёвага вопыту, правіламі прыёму на юрыдычны факультэт устаноўлены некаторыя перавагі для асоб, маючых стаж работы ці праслужыўшых ва Узброеных Сілах СССР.

В. ЧЫГІР,
дэкан юрыдычнага факультэта.

ЗАПРАШАЕМ ПРАЦОЎНУЮ МОЛАДЗЬ

Наша гутарка зацягнулася. Але юнакі і дзяўчаты спяшаліся задаць пытанні, каб даведацца як мага больш пра універсітэт, аб умовах жыцця, вучобы, адпачынку студэнтаў, арганізацыі заняткаў на падрыхтоўчым аддзяленні.

— Вось вы,— я звярнуўся да свайго суседа,— ужо каля чатырох год, як закончылі школу...

— І нядрэнна закончыў,— падхапіў ён.— Ды вось паслужыў на флоце, цяпер працую на заводзе і, шчыра кажучы, баюся, што не змагу вытрымаць уступных экзаменаў на механіка-матэматычны факультэт. Забылася многае. А вучыцца патрэбна абавязкова.

— Не толькі ў вас такое становішча. Многія юнакі і дзяўчаты пасля школы ідуць працаваць у калгасы, на заводы, каб больш дасканала праверыць сябе, узмужнець характарам, выбраць канчаткова свой асабісты шлях у жыцці. А каб паступіць у ВНУ, патрэбна грунтоўная падрыхтоўка. Вось для гэтага і існуе падрыхтоўчае аддзяленне ва універсітэце,— сказаў я.— За час вучобы слухачы маюць магчымасць не толькі добра паўтарыць матэрыял па праграме сярэдняй школы, але і назапасіць сіл, каб у час вучобы на абраным факультэце займацца з задавальненнем любімай справай.

Для гэтага ва універсітэце створаны ўсе ўмовы. На аддзяленні працуе калектыў высокакваліфікаваных выкладчыкаў.

— А колькі часу трэба вучыцца на падрыхтоўчым аддзяленні? — пытаецца нехта.

— Восем месяцаў,— адказваю.— Заняткі пачынаюцца з першага снежня пасля уступнага субяседавання з паступаючымі. Заявы прымаюцца з 1 кастрычніка па 10 лістапада. Субяседаванне праводзіцца па прадметах адпаведна з выбранай спецыяльнасцю. Напрыклад, на аддзяленні фізіка, матэматыка, радыёфізіка, прыкладная матэматыка субяседаванне праводзіцца па фізіцы і матэматыцы. Заняткі заканчваюцца ў ліпені выпускнымі экзаменамі. Слухачы, якія паспяхова здаюць экзамены, залічваюцца на першы курс універсітэта. Падрабязна аб усім гэтым можна даведацца з правілаў прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне.

— Гавораць, што для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне патрэбен працоўны стаж,— заўважае чарнявая дзяўчына.

— Так, слухачом падрыхтоўчага аддзялення мае права стаць той, хто не менш года ўдарна папрацаваў калгаснікам, рабочым саўгаса, прамысловага прадпрыемства або дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі.

Пытанням няма канца. Расказваю пра універсітэт. Яго сучасныя лабараторыі, кабінеты, бібліятэкі, музеі.

— Мы не забываемся таксама, што нашы слухачы — маладыя людзі, якім ледзь-ледзь споўнілася дваццаць. Таму ва універсітэце створаны ўсе ўмовы не толькі для вучобы, але і для адпачынку. На кожным факультэце працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, спартыўныя секцыі. Слухачы могуць прыняць удзел у рабоце літаратурнага аб'яднання «Узлёт».

— Студэнты, якія закончылі падрыхтоўчае аддзяленне, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта. Гэта старасты груп, камсоргі, прафоргі, камандзіры і камісары будаўнічых атрадаў. Увогуле слухачы падрыхтоўчага аддзялення жывуць цікавым і шматгранным жыццём, — заканчваю я.

Працоўную моладзь, якая жадае вучыцца на любым факультэце і добра падрыхтавацца да студэнцкага жыцця, мы запрашаем на падрыхтоўчае аддзяленне.

А. СЛУКА,
загадчык падрыхтоўчага аддзялення.

ДРУГАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

Якую б асноўную ў сваім жыцці прафесію ні выбраў чалавек, у яго акрамя яе існуе шмат розных захапленняў, якім аддае ён свой вольны час. У выяўленні і развіцці творчых задаткаў нашых студэнтаў, у набыцці імі канкрэтных ведаў для грамадска-палітычнай работы дапамагае факультэт грамадскіх прафесій (ФГП).

8 аддзяленняў ФГП чакаюць тых, хто марыць аб кіраўніцтве харэаграфічным калектывам ці аркестрам народных інструментаў, хто цікавіцца бальнымі танцамі ці імкнецца спасцігнуць таямніцы валодання мастакім словам. Тут можна атрымаць прафесію мастацкага афарміцеля. Любіцелі спорту атрымаюць магчымасць набыць навыкі судзейства і грамадскага інструктажу па розных відах спорту. Фотааматараў чакае знаёмства з асновамі фота- і кінасправы, а таксама фотакарэспандэнцкай дзейнасцю. Студэнцкі актыў зможа набыць прафесіянальныя арганізатарскія навыкі і веды па асновах арганізацыі камсамольскай работы. Методыку і навыкі прапагандысцкай і агітацыйна-масавай дзейнасці прапануе лектарска-прапагандысцкае аддзяленне.

На працягу аднаго-трох год (у залежнасці ад спецыяльнасці) нашым слухачам прадстаяць знаёмства з любімым грамадскім заняткам, сустрэчы, дыскусіі, рэпетыцыі, трэніроўкі. Урачысты выпуск у канцы года — не толькі фактычнае прызнанне прафесіянальнай падрыхтоўкі па адной з грамадскіх спецыяльнасцей, але і дакументальнае — выпускное пасведчанне, якое разам з дыпломам ВНУ становіцца цяпер пуцёўкай у жыццё.

Шлях у краіну ведаў

У нашым універсітэце ў навуковай рабоце ўдзельнічаюць 79 працэнтаў студэнтаў.

661 студэнт вёў пошук у 14 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і выканаў 4 гаспадарчыя дагаворы на суму 159 тыс. рублёў.

Па выніках Усесаюзнага грамадскага агляду работы СКБ ВНУ СНДЛ універсітэта ўзнагароджаны другой прэміяй і Ганаровым дыпломам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

У мінулым годзе па выніках Усесаюзнага конкурсу на лепшую студэнцкую навуковую работу па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, работы чатырох студэнтаў адзначаны медалём Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

186 студэнтаў надрукавалі вынікі даследаванняў, выкананых самастойна ці ў саўтарстве. Студэнты ўдзельнічалі ў фальклорных, дыялекталагічных, археалагічных, геаграфічных і іншых экспедыцыях.

Ты прыйдзеш у наш калектыў. Мы будзем рады твайму прыходу ў краіну навукі, твайму першаму дакладу, тваёй першай конкурснай рабоце.

Г. БЛІНКОЎ,
намеснік старшыні савета па НДРС.

І будуць зноў апладысменты

У нашым універсітэце, пры клубе, працуюць чатыры народныя творчыя калектывы: харавая капэла, аркестр народных інструментаў, ансамбль танца «Крыжачок» і драматычны тэатр. У кожнага з калектываў свая, на рэдкасць зайздросная творчая біяграфія. Самы старэйшы з іх — ансамбль танца «Крыжачок», які быў заснаван у 1945 годзе. Ансамбль карыстаецца вялікай папулярнасцю ў студэнцтва. У ім зараз дзейнічаюць асноўная, падрыхтоўчая і аркестравая групы. За плённую работу па эстэтычнаму выхаванню студэнцкай моладзі і творчыя поспехі танцавальнаму ансамблю «Крыжачок» у папярэдзадзень 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі прысвоена ганаровае званне народнага.

Праз год пасля заснавання «Крыжачка» узнікла харавая капэла. У 1959 годзе калектыў атрымаў званне народнага.

Аркестр народных інструментаў пачынаў сваю творчую дзейнасць адначасова з харавой капэлай. У 1965 годзе за высокае выканаўчае майстэрства калектыў удастоен звання народнага.

Студэнцкі драматычны тэатр параўнальна малады. Ён заснаван у 1966 годзе і з першай прэм'еры палюбіўся гледачу. Рэпертуар тэатра папаўняецца штогод. Цікава паставлены тэатрам «Маладая гвардыя» Фадзеева, «Рамэо і Джульета» Шэкспіра, «Валянцін і Валянціна» Рошчына, «Шасцёра любімых» Арбузава і іншыя.

Усе гэтыя творчыя калектывы клуба прадстаўлялі беларускае самадзейнае мастацтва ў розных рэспубліках нашай краіны і за мяжой.

Д. ТЫЦЮК.

ТВОЙ АКТЫЎНЫ АДПАЧЫНАК

Фізічнае выхаванне з'яўляецца адным з неабходных элементаў агульнай сістэмы навучання і камуністычнага выхавання студэнтаў. Яно з'яўляецца сродкам умацавання здароўя, актыўнага адпачынку, павышэння і захавання працаздольнасці і падрыхтоўкі да працы.

Ва універсітэце спартыўны клуб і кафедра фізічнага выхавання праводзяць вялікую работу па ўмацаванню здароўя і павышэнню спартыўнага майстэрства студэнтаў.

Спартыўны калектыў універсітэта, які налічвае звыш 10 тысяч студэнтаў і супрацоўнікаў, з'яўляецца адным з вядучых спартыўных калектываў сярод ВНУ рэспублікі. Каля 7 тысяч чалавек ахоплены рэгулярнымі заняткамі па фізічнаму выхаванню.

Звыш 2,5 тысячы студэнтаў і супрацоўнікаў рэгулярна займаюцца ў спартыўных секцыях па 26 відах спорту.

Заняткі па фізічнаму выхаванню для студэнтаў 1—3-х курсаў праводзяцца па 9 відах спорту: лёгкай атлетыцы, лыжах, спартыўнай, мастацкай гімнастыцы, вольнай і класічнай барацьбе, цяжкай атлетыцы, валейболу, спартыўнаму арыентаванню.

Студэнты, якія маюць спартыўныя разрады, павышаюць сваё спартыўнае майстэрства ў секцыях па відах спорту.

Фізічная культура і спорт трывала ўваходзяць у быт нашай моладзі. Ва універсітэце рэгулярна праводзяцца масавыя спартыўныя спаборніцтвы, турысцкія паходы, лыжныя вылазкі.

Фізічная культура і спорт з'яўляюцца надзейнымі памочнікамі ў вучобе. Многія вядучыя спартсмены універсітэта паспяхова спалучаюць добрую вучобу з заняткамі спортам.

З ліку студэнтаў за мінулы год было падрыхтавана пяць майстроў спорту СССР. 14 кандыдатаў у майстры спорту СССР. 79 спартсменаў вышэйшых разрадаў і 4306 спартсменаў масавых разрадаў. 2548 студэнтаў сталі значкістамі ГПА. 62 студэнты з'яўляюцца членамі зборных каманд Беларусі і Белсавета СДСТ «Буравеснік», а студэнтка IV курса юрфака Таццяна Бойка і студэнтка III курса біяфака Ларыса Клемянцёнак з'яўляюцца кандыдатамі ў зборную каманду СССР па лёгкай атлетыцы.

В. ШАПЯЛЕВІЧ,
старшыня спортклуба БДУ.



Усім неабходным абсталяваны спартыўныя залы універсітэта. Тут праводзяцца не толькі міжвузаўскія спартыўныя мерапрыемствы, але і рэспубліканскія спаборніцтвы.

Фота **Д. Прэса.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 184. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ—11559.